ЗАЦВЕРДЖАНА

Указ Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
15.05.2008 № 276

Палажэнне

аб дыпламатычнай службе
Рэспублікі Беларусь

## ГЛАВА 1
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Сапраўдным Палажэннем вызначаюцца асновы арганізацыі і функцыянавання дыпламатычнай службы Рэспублікі Беларусь (далей – дыпламатычная служба), парадак прыёму на дыпламатычную службу, яе праходжання і спынення, а таксама прававое палажэнне супрацоўнікаў, якія займаюць дыпламатычныя пасады ў Міністэрстве замежных спраў, дыпламатычных прадстаўніцтвах і консульскіх установах Рэспублікі Беларусь (далей – дыпламатычныя супрацоўнікі).

2. Дыпламатычная служба – від дзяржаўнай службы, якая ажыццяўляецца ў мэтах забеспячэння знешнепалітычнай і знешнеэканамічнай дзейнасці Рэспублікі Беларусь, прадстаўлення і абароны за мяжой правоў і інтарэсаў Рэспублікі Беларусь, яе грамадзян і юрыдычных асоб.

3. Прававую аснову дыпламатычнай службы складае Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, сапраўднае Палажэнне, Закон Рэспублікі Беларусь ад 14 чэрвеня 2003 года “Аб дзяржаўнай службе ў Рэспубліцы Беларусь” (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь,2003г., № 70, 2/953), іншыя акты заканадаўства Рэспублікі Беларусь, у тым ліку Венская канвенцыя аб дыпламатычных зносінах ад 18 красавіка 1961 года, Венская канвенцыя аб консульскіх зносінах ад 24 красавіка 1963 года і іншыя міжнародныя дагаворы Рэспублікі Беларусь.

4. Адносіны, звязаныя з паступленнем на дыпламатычную службу, праходжаннем, спыненнем дыпламатычнай службы, якія не ўрэгуляваныя сапраўдным Палажэннем, рэгулююцца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь аб дзяржаўнай службе, працоўным, пенсійным і іншым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 2
## СІСТЭМА ОРГАНАЎ ДЫПЛАМАТЫЧНАЙ СЛУЖБЫ

5. Сістэма органаў дыпламатычнай службы складаецца з Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь (далей – МЗС), дыпламатычных прадстаўніцтваў і консульскіх устаноў Рэспублікі Беларусь.

6. МЗС з’яўляецца рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання, які ажыццяўляе правядзенне дзяржаўнай палітыкі ў сферы знешніх сувязей, каардынацыю знешнепалітычнай і знешнеэканамічнай дзейнасці Рэспублікі Беларусь, кіраўніцтва працай дыпламатычных прадстаўніцтваў і консульскіх устаноў Рэспублікі Беларусь. МЗС падпарадкоўваецца Ураду Рэспублікі Беларусь, па асобных пытаннях дзейнасці, прадугледжаных заканадаўчымі актамі, можа падпарадкоўвацца выключна Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь. Палажэнне аб Міністэрстве замежных спраў зацвярджаецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

7. Дыпламатычнае прадстаўніцтва Рэспублікі Беларусь (далей – дыпламатычнае прадстаўніцтва) – пастаянна дзеючы орган знешніх зносін Рэспублікі Беларусь, які прадстаўляе Рэспубліку Беларусь у дзяржаве прабывання або міжнароднай арганізацыі ў мэтах падтрымкі афіцыйных міждзяржаўных адносін або афіцыйных адносін з міжнароднай арганізацыяй, выканання функцый па абароне правоў і інтарэсаў Рэспублікі Беларусь, яе грамадзян і юрыдычных асоб.

8. Да дыпламатычных прадстаўніцтваў адносяцца:

пасольствы Рэспублікі Беларусь у замежных дзяржавах (далей – пасольствы);

місіі Рэспублікі Беларусь у замежных дзяржавах (далей – місіі);

пастаянныя прадстаўніцтвы Рэспублікі Беларусь пры міжнародных арганізацыях (далей – пастаянныя прадстаўніцтвы).

9. Дыпламатычныя прадстаўніцтвы падпарадкоўваюцца МЗС і ажыццяўляюць сваю дзейнасць на аснове сапраўднага Палажэння, Палажэння аб дыпламатычных прадстаўніцтвах і консульскіх установах Рэспублікі Беларусь, Палажэння аб Пасольстве Рэспублікі Беларусь, якія зацвярджаюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь, іншых актаў заканадаўства Рэспублікі Беларусь з улікам заканадаўства дзяржавы прабывання.

Месцазнаходжанне дыпламатычнага прадстаўніцтва вызначаецца МЗС па ўзгадненні з дзяржавай прабывання.

10. Дыпламатычнае прадстаўніцтва ўзначальвае Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь (далей — надзвычайны і паўнамоцны пасол), або Пасланнік Рэспублікі Беларусь (далей – пасланнік), або Паверbegin ў справах Рэспублікі Беларусь

(далей – паверaны ў справах), альбо Пастаянны прадстаўнік Рэспублікі Беларусь пры міжнароднай арганізацыі (далей – пастаянны прадстаўнік пры міжнароднай арганізацыі).

Кіраўнік дыпламатычнага прадстаўніцтва прадстаўляе Рэспубліку Беларусь у дзяржаве прабывання або ў міжнароднай арганізацыі, непасрэдна кіруе працай дыпламатычнага прадстаўніцтва, нясе персанальную адказнасць за выкананне ўскладзеных на дыпламатычнае прадстаўніцтва задач і ажыццяўленне ім функцый, размяркоўвае службовыя абавязкі паміж супрацоўнікамі дыпламатычнага прадстаўніцтва.

У выпадку адсутнасці кіраўніка дыпламатычнага прадстаўніцтва (за выключэннем пастаяннага прадстаўніка пры міжнароднай арганізацыі) часовае выкананне яго абавязкаў ускладаецца на дыпламатычнага супрацоўніка дыпламатычнага прадстаўніцтва, часовага паверанага ў справах, загадам:

Міністэрства замежных спраў з уведамленнем Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь – калі пасада кіраўніка дыпламатычнага прадстаўніцтва вакантная або ён не можа выконваць свае функцыі;

кіраўніка дыпламатычнага прадстаўніцтва з уведамленнем МЗС – у выпадку часовай адсутнасці кіраўніка дыпламатычнага прадстаўніцтва.

11. Кіраўнік дыпламатычнага прадстаўніцтва акрэдытуецца ў дзяржаве прабывання пры кіраўніку дзяржавы, кіраўніку ўрада або міністры замежных спраў гэтай дзяржавы, пры міжнароднай арганізацыі.

Кіраўнік дыпламатычнага прадстаўніцтва можа быць акрэдытаваны па сумяшчальніцтву ў некалькіх замежных дзяржавах са згоды гэтых дзяржаў або пры некалькіх міжнародных арганізацыях.

Надзвычайны і паўнамоцны пасол, пасланнік, паверaны ў справах могуць выконваць функцыі пастаяннага прадстаўніка пры міжнароднай арганізацыі, якая знаходзіцца на тэрыторыі дзяржавы яго прабывання.

Назначэнне на пасаду кіраўніка дыпламатычнага прадстаўніцтва (за выключэннем пастаяннага прадстаўніка пры міжнароднай арганізацыі) ажыццяўляецца пасля атрымання агрэмана – згоды дзяржавы прабывання.

12. Консульская ўстанова Рэспублікі Беларусь (далей – консульская ўстанова) – пастаянна дзеючы орган знешніх зносін Рэспублікі Беларусь, які прадстаўляе Рэспубліку Беларусь у дзяржаве прабывання ў мэтах абароны правоў і інтарэсаў Рэспублікі Беларусь, яе грамадзян і юрыдычных асоб.

13. Консульскія ўстановы падраздзяляюцца на наступныя класы:

генеральныя консульствы;

консульствы;

віцэ-консульствы;

консульскія агенцтвы.

Консульскія дзеянні на тэрыторыі дзяржавы прабывання могуць выконваць таксама дыпламатычныя прадстаўніцтвы. Асобныя консульскія дзеянні на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь выконваюцца консульскімі пунктамі і консульскім упраўленнем МЗС.

14. Консульскія ўстановы падпарадкоўваюцца МЗС і дзейнічаюць пад непасрэдным кіраўніцтвам дыпламатычнага прадстаўніцтва ў дзяржаве прабывання. Консульскія ўстановы ажыццяўляюць сваю дзейнасць на аснове сапраўднага Палажэння, Консульскага статута Рэспублікі Беларусь, які зацвярджаецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь, іншых актаў заканадаўства Рэспублікі Беларусь з улікам заканадаўства дзяржавы прабывання.

Месцазнаходжанне консульскай установы, яе клас і консульская акруга (раён, які адведзены консульскай установе для выканання консульскіх функцый) вызначаюцца МЗС па ўзгадненні з дзяржавай прабывання.

15. Консульскую ўстанову ў залежнасці ад яе класа ўзначальвае адпаведна Генеральны консул Рэспублікі Беларусь (далей – генеральны консул), консул, віцэ-консул, консульскі агент.

16. Кіраўнік консульскай установы прадстаўляе Рэспубліку Беларусь у консульскай акрузе, непасрэдна кіруе працай консульскай установы, нясе персанальную адказнасць за выкананне ўскладзеных на консульскую ўстанову задач і ажыццяўленне ёй функцый, размяркоўвае службовыя абавязкі паміж дыпламатычнымі супрацоўнікамі консульскай установы.

У выпадку адсутнасці кіраўніка консульскай установы часовае выкананне яе абавязкаў ускладаецца на дыпламатычнага супрацоўніка консульскай установы загадам:

Міністра замежных спраў з уведамленнем Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь – калі пасада генеральнага консула вакантная або ён не можа выконваць свае функцыі;

Міністра замежных спраў – калі пасада другога кіраўніка консульскай установы вакантная або ён не можа выконваць свае функцыі;

кіраўніка консульскай установы з уведамленнем МЗС – у выпадку часовай адсутнасці кіраўніка консульскай установы.

17. Кіраўнік консульскай установы пры назначэнні на пасаду атрымвае ад МЗС консульскі патэнт і пачынае выкананне сваіх абавязкаў пасля атрымання экзэкватуры – дазволу дзяржавы прабывання.

## ГЛАВА 3
## ПРЫЁМ НА ДЫПЛАМАТЫЧНУЮ СЛУЖБУ

18. Паступленне на дыпламатычную службу ажыццяўляецца ў адпаведнасці з заканадаўствам аб дзяржаўнай службе.

Да асоб, якія паступаюць на дыпламатычную службу, акрамя патрабаванняў, якія ўстаноўлены заканадаўствам аб дзяржаўнай службе, дадаткова прад'яўляюцца наступныя патрабаванні:

наяўнасць вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці (пералік спецыяльнасцей устанаўліваецца МЗС);

валоданне, як правіла, дзвюма або болей замежнымі мовамі;

наяўнасць дзелавых, маральных і псіхалагічных якасцей, якія адпавядаюць зацверджаным МЗС, кваліфікацыйным патрабаванням, якія прад'яўляюцца да адпаведнай пасады;

валоданне асновамі інфармацыйных тэхналогій;

вадзіцельскі стаж не менш за 2 гады (для назначэння на пасады ў дыпламатычным прадстаўніцтве або консульскай установе);

адсутнасць абмежаванняў для работы са звесткамі, якія з'яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі;

адсутнасць медыцынскіх супрацьпаказанняў для выканання службовых абавязкаў у МЗС, дыпламатычных прадстаўніцтвах і консульскіх установах.

Акалічнасцю, якая перашкаджае прыёму на дыпламатычную службу або праходжанню дыпламатычнай службы, можа быць прыналежнасць да замежнага грамадзянства мужа (жонкі), а таксама сумесна пражываючых з дыпламатычным супрацоўнікам або кандыдатам для паступлення на дыпламатычную службу бацькоў і дзяцей, у тым ліку ўсыноўленых (удачароных), пасынкаў і падчарыц. Пытанне аб мэтазгоднасці прыёму такой асобы на дыпламатычную службу або далейшага праходжання ёй дыпламатычнай службы, вырашаецца Міністрам замежных спраў пасля запыту меркаванняў упаўнаважанага дзяржаўнага органа па абароне дзяржаўных сакрэтаў.

19. У мэтах праверкі адпаведнасці патрабаванням, якія ўстаноўлены ў частцы другой пункта 18 сапраўднага Палажэння, з асобамі, якія ўпершыню паступаюць на дыпламатычную службу, праводзяцца экзамены, тэсціраванне і субяседаванне ў парадку, які ўстаноўлены МЗС.

20. Прыём на дыпламатычную службу ажыццяўляецца шляхам назначэння на дыпламатычную пасаду ў адпаведнасці з заканадаўствам аб дзяржаўнай службе і сапраўдным Палажэннем, як правіла, на конкурснай аснове.

Конкурсны адбор праводзіцца камісіяй па конкурсным адборы і ратацыі супрацоўнікаў сістэмы органаў дыпламатычнай службы, змест і парадак працы якой зацвярджаюцца МЗС.

21. Для грамадзяніна, які ўпершыню пастулае на дыпламатычную службу, па ўзгадненні бакоў можа ўстанаўлівацца папярэдні іспыт на тэрмін ад трох да шасці месяцаў.

Папярэдні іспыт не ўстанаўліваецца пры назначэнні на дыпламатычныя пасады, якія ўключаны ў кадравы рэестр Кіраўніка дзяржавы Рэспублікі Беларусь, кадравы рэестр Совета Міністраў Рэспублікі Беларусь, а таксама для асоб з ліку супрацоўнікаў іншых дзяржаўных органаў і іншых дзяржаўных арганізацый, якія назначаюцца на дыпламатычныя пасады ў парадку пераводу па запыту Міністра замежных спраў у мэтах часовага выканання ў дыпламатычных прадстаўніцтвах і консульскіх установах функцый, якія патрабуюць спецыяльнай кваліфікацыі.

22. Назначэнне на дыпламатычныя пасады ажыццяўляецца на аснове кантракта, які заключаецца ў адпаведнасці з заканадаўствам аб дзяржаўнай службе, заканадаўствам аб працы і сапраўдным Палажэннем.

23. Назначэнне на пасады і вызваленне ад пасад Міністра замежных спраў, надзвычайных і паўнамоцных паслоў, пастаянных прадстаўнікоў пры міжнародных арганізацыях ажыццяўляецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

Кандыдатуры на ўказаныя пасады разглядаюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь па прапанове Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь. Пры гэтым кандыдатуры надзвычайных і паўнамоцных паслоў і пастаянных прадстаўнікоў пры міжнародных арганізацыях павінны быць папярэдне разгледжаны ў пастаянных камісіях Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, якія валодаюць пытаннямі міжнародных адносін, якія па выніках разгляду прымаюць рашэнні рэкамендацыйнага характару.

24. Назначэнне на пасады і вызваленне ад пасад намеснікаў Міністра замежных спраў, дырэктара дэпартамента МЗС, пасланнікаў, павераных у справах, саветнікаў-пасланннікаў, генеральных консулаў ажыццяўляюцца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь у парадку, які ўстаноўлены заканадаўствам Рэспублікі Беларусь. Кандыдатуры на ўказаныя пасады ўносяцца ў Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь МЗС.

25. Назначэнне на дыпламатычныя пасады, якія не ўказаны ў пунктах 23 і 24 сапраўднага Палажэння, ажыццяўляецца Міністрам замежных спраў у парадку, які ўстаноўлены заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

26. Дыпламатычны супрацоўнік пры прыёму на дыпламатычную службу прыносіць прысягу Рэспубліцы Беларусь наступнага зместу:

“Я, (прозвішча, імя, імя па бацьку), паступаючы на дыпламатычную службу Рэспублікі Беларусь, урачыста клянуся быць адданым Рэспубліцы Беларусь, выконваць і абараняць яе Канстытуцыю, чэсна і добрасумленна выконваць ускладзеныя на мяне абавязкі.

Абяцаю дзейнічаць на davераным мне пасадзе ў інтарэсах Рэспублікі Беларусь, яе народа, Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і Урада Рэспублікі Беларусь.”

Парадак прынясення прысягі ўстанаўліваецца МЗС.

## ГЛАВА 4
## РАТАЦЫЯ ДЫПЛАМАТЫЧНЫХ СУПРАЦОЎНІКАЎ

27. Ратацыя – гэта мэтанакіраванае чаргаванне замяшчэння дыпламатычнымі супрацоўнікамі дыпламатычных пасад у сістэме органаў дыпламатычнай службы з улікам спецыялізацыі кадраў, іх кваліфікацыі і прафесійнай падрыхтоўкі.

У парадку ратацыі дыпламатычны супрацоўнік можа быць назначаны з яго згоды з МЗС на дыпламатычную пасаду ў дыпламатычнае прадстаўніцтва або консульскую ўстанову, або з аднаго дыпламатычнага прадстаўніцтва ці консульскай установы на дыпламатычную пасаду ў другое дыпламатычнае прадстаўніцтва ці консульскую ўстанову, альбо з дыпламатычнага прадстаўніцтва ці консульскай установы на дыпламатычную пасаду ў МЗС.

28. Ратацыя дыпламатычных супрацоўнікаў праводзіцца, як правіла, на планавай аснове і пасля конкурснага адбору, які ажыццяўляецца камісіяй па конкурсным адборы і ратацыі супрацоўнікаў сістэмы органаў дыпламатычнай службы.

29. Ратацыя дыпламатычных супрацоўнікаў ажыццяўляецца з улікам тэрмінаў, устаноўленымі сапраўдным пунктам.

Дыпламатычны супрацоўнік, які ўпершыню паступае на дыпламатычную службу, можа быць назначаны з яго згоды на дыпламатычную пасаду ў дыпламатычнае прадстаўніцтва або консульскую ўстанову па заканчэнні двух гадоў працы ў МЗС.

У сувязі са службовай неабходнасцю дыпламатычны супрацоўнік  з яго згоды можа быць назначаны на дыпламатычную пасаду ў дыпламатычнае прадстаўніцтва або консульскую ўстанову да заканчэння тэрміну, указаныя ў частцы другой сапраўднага пункта.

Тэрмін працы ў дыпламатычных прадстаўніцтвах і консульскіх установах дыпламатычных супрацоўнікаў, якія займаюць пасады да першага сакратара або консула ўключна, устанаўліваецца да трох гадоў, а для саветнікаў, старшых саветнікаў і саветнікаў-пасланнікаў – да чатырох гадоў. Міністрам замежных спраў па службовай неабходнасці указаны тэрмін можа быць прадоўжаны або скарочаны ва ўстаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь парадку.

Працягласць працы надзвычайных і паўнамоцных паслоў, пастаянных прадстаўнікоў пры міжнародных арганізацыях, генеральных консулаў устанаўліваецца да пяці гадоў. У сувязі са службовай неабходнасцю па прадстаўленні Міністра замежных спраў указаны тэрмін можа быць прадоўжаны або скарочаны ў адносінах надзвычайных і

паўнамоцных паслоў, пастаянных прадстаўнікоў пры міжнародных арганізацыях – Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, у адносінах генеральных консулаў – Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь па ўзгадненні з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

У сувязі са службовай неабходнасцю надзвычайныя і паўнамоцныя паслы, пастаянныя прадстаўнікі пры міжнародных арганізацыях могуць быць адазваны ў Рэспубліку Беларусь для кансультацый. Такі водзыў ажыццяўляецца Міністрам замежных спраў у адносінах  надзвычайных і паўнамоцных паслоў, пастаянных прадстаўнікоў пры міжнародных арганізацыях – па ўзгадненні з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, у адносінах генеральных консулаў – па ўзгадненні з Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь. Выплаты за перыяд знаходжання такіх асоб на кансультацыях у Рэспубліцы Беларусь ажыццяўляюцца, зыходзячы з заработнай платы па суаднесенай пасадзе ў МЗС.

Тэрмін працы дыпламатычных супрацоўнікаў у МЗС на перыяд паміж працай у дыпламатычных прадстаўніцтвах і консульскіх установах устанаўліваецца не менш за тры гады. У выпадку службовай неабходнасці дыпламатычны супрацоўнік можа быць назначаны на дыпламатычную пасаду ў дыпламатычнае прадстаўніцтва або консульскую ўстанову да заканчэння ўказанага тэрміну, але не раней чым праз адзін год пасля назначэння на дыпламатычную пасаду ў МЗС.

Вучоба або павышэнне кваліфікацыі з адрывам ад працы па накіраванні МЗС залічваюцца ў тэрміны, якія прадугледжаны ў частцы сёмай сапраўднага пункта, калі дыпламатычны супрацоўнік не пазней за тры месяцы па заканчэнні вучобы прыступіў да працы ў сістэме органаў дыпламатычнай службы.

30. Для дыпламатычных супрацоўнікаў дыпламатычных прадстаўніцтваў і консульскіх устаноў у дзяржавах з асоба складанымі ваенна-палітычнымі або (і) цяжкімі кліматычнымі ўмовамі, куды вельміцяжка набраць кадры,  можа быць прадугледжана ратацыя ў дыпламатычныя прадстаўніцтвы і консульскія ўстановы ў дзяржавы з больш спрыяльнымі ўмовамі без захавання  тэрмінаў, якія прадугледжаны ў частцы сёмай пункта 29 сапраўднага Палажэння.

Пералік дзяржаў, указаных ў частцы першай сапраўднага пункта, вызначаецца МЗС.

31. Дыпламатычныя супрацоўнікі перад накіраваннем на працу ў дыпламатычныя прадстаўніцтвы або консульскія ўстановы праходзяць стажыроўку для падрыхтоўкі да выканання абавязкаў у дыпламатычных прадстаўніцтвах і консульскіх установах у парадку, які вызначаны МЗС.

Адказ ад праходжання стажыроўкі або непраходжанне стажыроўкі з’яўляюцца асновай для адмовы ў накіраванні дыпламатычнага супрацоўніка на працу ў дыпламатычнае прадстаўніцтва або консульскую ўстанову.

## ГЛАВА 5
## ПЕРАВОД ДЫПЛАМАТЫЧНЫХ СУПРАЦОЎНІКАЎ У ІНШЫЯ ДЗЯРЖАЎНЫЯ ОРГАНЫ І ІНШЫЯ ДЗЯРЖАЎНЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ АБО ОРГАНЫ МІЖНАРОДНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ АБО МІЖДЗЯРЖАЎНЫХ АБ’ЯДНАННЯЎ

32. Дыпламатычныя супрацоўнікі з іх згоды могуць быць пераведзены для працы ў іншыя дзяржаўныя органы і іншыя дзяржаўныя арганізацыі для рэалізацыі задач, звязаных са знешнепалітычнай або знешнеэканамічнай дзейнасцю дзяржавы, або для працы на замацаваных за Рэспублікай Беларусь квотных пасадах у органах міжнароднай арганізацыі або міждзяржаўных аб’яднанняў.

Супрацоўнікі, якія пераведзены з органаў сістэмы дыпламатычнай службы для працы ва ўказаныя ў частцы першай сапраўднага пункта органы і іншыя арганізацыі, маюць права ўдзельнічаць у конкурсным адборы, які праводзіцца камісіяй па конкурсным адборы і ратацыі супрацоўнікаў сістэмы органаў дыпламатычнай службы. Пры пераводзе такіх супрацоўнікаў для працы ў органы сістэмы дыпламатычнай службы перыяд іх працы ва ўказаных у частцы першай сапраўднага пункта органах і іншых арганізацыях залічваюцца ў тэрміны, устаноўленыя часткай сёмай пункта 29 і пунктам 44 сапраўднага Палажэння, але не больш пяці гадоў.

33. Перавод дыпламатычнага супрацоўніка для працы ў іншы дыпламатычны орган або іншую дзяржаўную арганізацыю для рэалізацыі задач, звязаных са знешнепалітычнай або знешнеэканамічнай дзейнасцю дзяржавы, ажыццяўляецца на аснове пісьмовага хадайніцтва гэтых дзяржаўнага органа або іншай дзяржаўнай арганізацыі і афармляецца загадам Міністра замежных спраў.

Перавод дыпламатычных супрацоўнікаў для работы ў органах міжнародных арганізацый або міждзяржаўных аб’яднанняў афармляюцца загадам Міністра замежных спраў і ажыццяўляецца ў адпаведнасці з заканадаўствам, у тым ліку з міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь, і правіламі адпаведных міжнародных арганізацый або міждзяржаўных аб’яднанняў.

Наступны перавод супрацоўнікаў, указаных ў частцы першай і другой сапраўднага пункта, для працы ў сістэме органаў дыпламатычнай службы ажыццяўляецца з іх ведама на аснове пісьма Міністра замежных спраў і афармляецца загадам.

34. Міністр замежных спраў па ўзгадненні з кіраўніком адпаведнага дзяржаўнага органа і іншай дзяржаўнай арганізацыі можа назначаць на дыпламатычныя пасады супрацоўнікаў гэтых дзяржаўных органаў і іншых дзяржаўных арганізацый з іх згоды ў мэтах часовага выканання ў дыпламатычных прадстаўніцтвах або консульскіх установах функцый, якія патрабуюць спецыяльнай кваліфікацыі.

Пры звальненні ў сувязі з назначэннем на дыпламатычную пасаду такі супрацоўнік (з яго згоды) уключаецца ў кадравы рэзерв дзяржаўнага органа або іншай дзяржаўнай арганізацыі, кіраўнік якой узгадніў яго перавод у сувязі з назначэннем на дыпламатычную пасаду.

## ГЛАВА 6
## ВОДЗЫЎ ДЫПЛАМАТЫЧНЫХ СУПРАЦОЎНІКАЎ, СПЫНЕННЕ ДЫПЛАМАТЫЧНАЙ СЛУЖБЫ

35. Аснаваннем для водзыва ў Рэспубліку Беларусь дыпламатычных супрацоўнікаў дыпламатычных прадстаўніцтваў і консулькіх установаў да заканчэнне тэрміну дзеяння кантракта, які заключаны з ім, з'яўляюцца:

здзяйсненне дыпламатычным супрацоўнікам дзеяння, за якое ён панясе крымінальную або адміністратыўную адказнасць у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь або дзяржавы прабывання;

здзяйсненне ў дзяржаве прабывання членам сям'і дыпламатычнага супрацоўніка* дзеяння, за якое ён панясе крымінальную або адміністратыўную адказнасць у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь або дзяржавы прабывання;

аб'яўленне дыпламатычнага супрацоўніка непрымальным або персонай нон грата ў дзяржаве прабывання;

спыненне дыпламатычнай службы па аснаваннях, прадугледжаных абзацамі другім, чацвёртым і пятым часткі першай пункта 37 сапраўднага Палажэння.

Водзыў у Рэспубліку Беларусь афармляецца загадам Міністра замежных спраў.

36. Дыпламатычныя супрацоўнікі, якія былі адазваны ў Рэспубліку Беларусь у адпаведнасці з пунктам 35 сапраўднага Палажэння, спыняюць дыпламатычную службу або адхіляюцца ад пасады на тэрмін не больш чым два месяцы са дня водзыву пры неабходнасці правядзення службовага расследавання па абставінах, якія прадугледжаны ў абзацах другім, трэцім, пятым часткі першай пункта 35 сапраўднага Палажэння, або вырашэння пытання аб працаўладкаванні дыпламатычных супрацоўнікаў, якія былі адазваны па абставінах, якія прадугледжаны ў абзацы чацвёртым часткі першай пункта 35 сапраўднага Палажэння.

Па выніках службовага расследавання прымаецца рашэнне:

аб спыненні дыпламатычнай службы ў парадку, які ўстаноўлены заканадаўствам Рэспублікі Беларусь;

аб назначэнні дыпламатычнага супрацоўніка на другую дыпламатычную або іншую

---

* Пад членам сям'і дыпламатычнага супрацоўніка ў сапраўдным Палажэнні разумеецца муж (жонка), непаўналетнія дзеці, у тым ліку ўсыноўленыя (удачароныя), пасынкі і падчарыцы, а таксама непрацаздольныя, якія знаходзяцца на яго ўтрыманні, паўналетнія дзеці, у тым ліку ўсыноўленыя (удачароныя), пасынкі і падчарацы.

дзяржаўную пасаду ў сістэме органаў дыпламатычнай службы або яго пераводдзе ў парадку, які ўстаноўлены пунктам 33 сапраўднага Палажэння. Пры гэтым дыпламатычнаму супрацоўніку за перыяд яго адхілення ад пасады ажыццяўляюцца выплаты, зыходзячы з заработнай платы па адпаведнай пасадзе ў МЗС;

аб знаходжанні на папярэдняй пасадзе, калі факты, якія з'явіліся аснаваннем для адхілення дыпламатычнага супрацоўніка ад пасады, не знайшлі пацверджання.

Рашэнне аб спыненні дыпламатычнай службы або аб адхіленні ад пасады дыпламатычнага супрацоўніка прымаецца ва ўстаноўленым парадку службовай асобай або дзяржаўным органам, які назначыў яго на пасаду.

спыненне дыпламатычнай службы і адхіленне ад пасады дыпламатычных супрацоўнікаў, якія займаюць пасады, якія ўключаны ў кадравы рэестр Кіраўніка дзяржавы Рэспублікі Беларусь, ажыццяўляецца ў парадку, які ўстаноўлены Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

37. Аснаваннямі для спынення дыпламатычнай службы па ініцыятыве наймальніка з'яўляюцца:

перадача дыпламатычным супрацоўнікам звестак, якія складаюць дзяржаўныя сакрэты;

спыненне дыпламатычным супрацоўнікам грамадзянства Рэспублікі Беларусь у выніку выхаду з грамадзянства або яго страты;

уступленне ў законную сілу ў адносінах да дыпламатычнага супрацоўніка абвінаваўчага прыгавору суда;

грубае парушэнне службовых абавязкаў, здзяйсненне праступка, несумяшчальнага са знаходжаннем на дыпламатычнай службе;

адказ без уважлівых прычын дыпламатычнага супрацоўніка МЗС ад дзвюх прапаноў аб назначэнні на дыпламатычную пасаду ў дыпламатычнае прадстаўніцтва або консульскую ўстанову;

адказ дыпламатычнага супрацоўніка, які закончыў працу ў дыпламатычным прадстаўніцтве або консульскай установе, ад дзвюх прапаноў аб назначэнні на пасаду ў МЗС або ў дзяржаўную арганізацыю, якая падкіравана МЗС;

іншыя аснаванні, прадугледжаныя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь аб дзяржаўнай службе.

Дыпламатычная служба можа быць таксама спынена ў выпадку водзыву дыпламатычнага супрацоўніка ў адпаведнасці з абзацамі другім – чацвёртым часткі першай пункта 35 сапраўднага Палажэння.

## ГЛАВА 7
## ДЫПЛАМАТЫЧНЫЯ ПАСАДЫ І ДЫПЛАМАТЫЧНЫЯ РАНГІ

38. Для дыпламатычных супрацоўнікаў у сістэме органаў дыпламатычнай службы ўстанаўліваюцца дыпламатычныя пасады і адпаведныя ім дыпламатычныя рангі згодна з дадаткам.

39. Дыпламатычным супрацоўнікам з улікам займаемай пасады і кваліфікацыі прысвойваюцца наступныя дыпламатычныя рангі:

Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол;

Надзвычайны І Паўнамоцны Пасланнік першага класа;

Надзвычайны і Паўнамоцны Пасланнік другога класа;

саветнік першага класа;

саветнік другога класа;

першы сакратар першага класа;

першы сакратар другога класа;

другі сакратар першага класа;

другі сакратар другога класа;

трэці сакратар;

аташэ.

40. Прысваенне дыпламатычных рангаў адбываецца ў паслядоўным парадку ў адпаведнасці з займаемай пасадай, кваліфікацыяй дыпламатычнага супрацоўніка і стажам працы.

41. Прысваенне дыпламатычных рангаў ажыццяўляецца:

Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла; Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасланніка першага класа, Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасланніка другога класа – Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь;

іншых дыпламатычных рангаў – Міністрам замежных спраў на аснаванні рэкамендацый камісіі МЗС па атэстацыі дзяржаўных служачых, прысваенні дыпламатычных рангаў і класаў дзяржаўным служачым.

42. Дыпламатычныя рангі захоўваюцца пажыццёва, за выключэннем выпадкаў, якія прадугледжаны ў частцы другой пункта 46 сапраўднага Палажэння. Аб прысвоеным дыпламатычным рангу ўносіцца запіс у працоўную кніжку.

Прысваенне дыпламатычным супрацоўнікам МЗС класаў дзяржаўных служачых ажыццяўляецца ў парадку, устаноўленым заканадаўствам аб дзяржаўнай службе.

43. Асобам, якія ўпершыню паступаюць на дыпламатычную службу, дыпламатычны ранг прысвойваецца не раней чым праз адзін год.

Асобам, якія ўпершыню паступаюць на дзяржаўную службу і якія назначаюцца на пасады і вызваляюцца ад пасад Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, тэрмін, указаны ў першай частцы сапраўднага пункта, не ўстанаўліваецца.

44. Для дыпламатычных супрацоўнікаў устанаўліваюцца, як правіла, наступныя тэрміны знаходжання ў дыпламатычных рангах:

для аташэ, трэцяга сакратара, другога сакратара другога класа, другога сакратара першага класа, першага сакратара другога класа – не менш за два гады;

для першага сакратара першага класа, саветнікаў другога і першага класа – не менш за тры гады.

Ва ўказаныя тэрміны залічваецца:

праца ў сістэме органаў дыпламатычнай службы;

час працы ў іншых дзяржаўных органах і іншых дзяржаўных арганізацыях альбо на замацаваныя за Рэспублікай Беларусь квотных пасадах у органах міжнародных арганізацый ці міждзяржаўных аб'яднаннях, у якія дыпламатычны супрацоўнік быў пераведзены ў парадку, прадугледжаным пунктам 33 сапраўднага Палажэння;

вучоба або павышэнне кваліфікацыі з адрывам ад работы па накіраванні МЗС, калі дыпламатычны работнік не пазней чым праз тры месяцы пасля заканчэння вучобы прыступіў да працы ў сістэме органаў дыпламатычнай службы.

Тэрміны знаходжання дыпламатычных супрацоўнікаў у дыпламатычных рангах Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасланніка другога класа, Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасланніка першага класа, Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла не ўстанаўліваюцца.

45. Дыпламатычныя супрацоўнікі ў асобных выпадках за асобыя дасягненні ў працы або асобыя заслугі могуць быць павышаны ў дыпламатычным рагу да заканчэння ўстаноўленага тэрміну (датэрміновае прысваенне наступнага дыпламатычнага рангу па займаемай пасадзе) або без захавання чарговасці іх прысваення (прысваенне нечарговага дыпламатычнага рангу).

Датэрміновае прысваенне чарговага дыпламатычнага рангу па займаемай пасадзе або прысваенне нечарговага дыпламатычнага рангу дыпламатычнаму супрацоўніку магчыма не больш за два разы на працягу усяго перыяду яго працы ў сістэме органаў дыпламатычнай службы.

Дыпламатычным супрацоўнікам, якім прысвоена званне “Герой Беларусі”, якія ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі Рэспублікі Беларусь і СССР, за выключэннем юбілейных медалёў Рэспублікі Беларусь і СССР, і дыпламатычным супрацоўнікам, якім прысвоены ганаровыя званні Рэспублікі Беларусь і СССР, можа быць прысвоены дыпламатычны ранг на адзін вышэй у параўнанні з дыпламатычным рангам, які прадугледжаны па займаемай пасадзе, але не больш чым адзін раз на працягу ўсяго перыяду працы ў сістэме органаў дыпламатычнай службы.

46. Паніжэнне ў дыпламатычным рангу або пазбаўленне дыпламатычнага рангу можа ажыццяўляцца ў адпаведнасці з пунктам 52 сапраўднага Палажэння.

Пры спыненні дыпламатычнай службы па аснаваннях, прадугледжаных у абзацах другім, чацвёртым, пятым часткі першай пункта 37 сапраўднага Палажэння, дыпламатычны супрацоўнік адначасова пазбаўляецца дыпламатычнага рангу.

Пазбаўленне дыпламатычнага рангу азначае пазбаўленне дыпламатычнага супрацоўніка ўсіх папярэдніх дыпламатычных рангаў.

47. Аднаўленне дыпламатычнага супрацоўніка ў папярэднім дыпламатычным рангу адбываецца пасля праходжання атэстацыі і не раней чым праз шэсць месяцаў са дня прыняцця рашэння аб паніжэнні ў дыпламатычным рангу або пазбаўленні дыпламатычнага рангу, калі іншае не прадугледжана ў дадзеным рашэнні.

Датэрміновае прысваенне чарговага дыпламатычнага рангу па займаемай пасадзе або прысваенне нечарговага дыпламатычнага рангу, прысваенне дыпламатычнага рангу на адзін вышэй у параўнанні з дыпламатычным рангам, прадугледжаным па займаемай пасадзе, паніжэнне, пазбаўленне і аднаўленне ў дыпламатычным рангу ажыццяўляецца ў тым жа парадку, што і прысваенне.

## ГЛАВА 8
## АТЭСТАЦЫЯ ДЫПЛАМАТЫЧНЫХ СУПРАЦОЎНІКАЎ

48. Атэстацыя дыпламатычных супрацоўнікаў праводзіцца адзін раз у тры гады, але не радзей чым адзін раз у пяць гадоў.

Па рашэнні Міністра замежных спраў можа праводзіцца нечарговая атэстацыя дыпламатычных супрацоўнікаў.

49. Атэстацыя дыпламатычных супрацоўнікаў, якія займаюць дыпламатычныя пасады, уключаныя ў кадравы рэестр Кіраўніка дзяржавы Рэспублікі Беларусь, кадравы рэестр Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, праводзіцца ў парадку, які ўстаноўлены заканадаўствам Рэспублікі Беларусь для дадзеных катэгорый супрацоўнікаў.

Атэстацыя дыпламатычных супрацоўнікаў, якія назначаюцца на пасады Міністрам замежных спраў, праводзіцца камісіяй МЗС па атэстацыі дзяржаўных служачых, прысваенні дыпламатычных рангаў і класаў дзяржаўных служачых.

Атэстацыя дыпламатычных супрацоўнікаў, якія накіраваны для далейшага праходжання дыпламатычнай службы на замацаваных за Рэспублікай Беларусь квотных пасадах у органах міжнародных арганізацый або міждзяржаўных аб’яднаннях, праводзіцца ў парадку, устаноўленым Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

Дыпламатычныя супрацоўнікі, якія пераведзены для працы ў іншыя дзяржаўныя органы і дзяржаўныя арганізацыі для рэалізацыі задач, звязаных са знешнепалітычнай

або знешнеэканамічнай дзейнасцю дзяржавы, атэстуюцца ў парадку, якія вызначаецца кіраўнікамі дадзеных дзяржаўных органаў і іншых арганізацый.

## ГЛАВА 9
## ПРАВЫ, АБАВЯЗКІ, ЗААХВОЧВАННІ І АДКАЗНАСЦЬ ДЫПЛАМАТЫЧНЫХ СУПРАЦОЎНІКАЎ

50. Дыпламатычныя супрацоўнікі карыстаюцца правамі і выконваюць абавязкі, прадугледжаныя заканадаўствам аб дзяржаўнай службе, а таксама сапраўдным Палажэннем.

Дыпламатычныя супрацоўнікі ў перыяд працы ў дыпламатычных прадстаўніцтвах і консульскіх установах павінны паважаць заканадаўства, правілы і традыцыі дзяржавы прабывання, з годнасцю прадстаўляць Рэспубліку Беларусь.

У залежнасці ад становішча ў свеце, сітуацыі ў асобнай дзяржаве або рэгіёне свету МЗС у мэтах забеспячэння інтарэсаў Рэспублікі Беларусь, а таксама бяспекі дыпламатычных супрацоўнікаў і членаў іх сямей мае права ўводзіць для дыпламатычных супрацоўнікаў дыпламатычных прадстаўніцваў і консульскіх устаноў часовыя дадатковыя абмежаванні, якія датычацца рэжыму працы і адпачынку, парадка перамяшчэння ў краіне прабывання і выезду за яе межы.

51. Дыпламатычныя супрацоўнікі ў выпадках, прадугледжаных заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, заахвочваюцца:

аб’яўленнем падзякі;

аднаразовым грашовым узнагароджаннем;

узнагароджаннем каштоўным падарункам;

нечарговым прысваеннем чарговага дыпламатычнага рангу па займаемай пасадзе;

прысваенне нечарговага дыпламатычнага рангу;

прысваенне дыпламатычнага рангу на адзін вышэй у параўнанні з дыпламатычным рангам, прадугледжаным па займаемай пасадзе;

павышэннем ў пасадзе;

узнагароджаннем Ганаровай граматай МЗС;

іншымі відамі заахвочванняў, прадугледжаных заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

За асобыя заслугі перад Республікай Беларусь, шматгадовую добрасумленную працу ў сістэме органаў дыпламатычнай службы дыпламатычныя работнікі могуць быць ва ўстаноўленым парадку прадстаўлены да ўзнагароджання дзяржаўнымі ўзнагародамі Рэспублікі Беларусь.

Парадак заахвочвання дыпламатычных супрацоўнікаў устанаўліваецца МЗС у адпаведнасці з сапраўдным Палажэннем і іншымі актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

52. Да дыпламатычных супрацоўнікаў за невыкананне або неналежнае выкананне ўскладзеных на іх абавязкаў, акрамя мер дысцыплінарнага спагнання, прадугледжаных заканадаўствам, могуць прымяняцца наступныя меры дысцыплінарнага спагнання:

паніжэнне дыпламатычнага рангу на адну ступень;

пазбаўленне дыпламатычнага рангу.

## ГЛАВА 10
## МАТЭРЫЯЛЬНАЕ І САЦЫЯЛЬНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ДЫПЛАМАТЫЧНЫХ СУПРАЦОЎНІКАЎ

53. Умовы аплаты працы дыпламатычных супрацоўнікаў МЗС устанаўліваюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам, якое рэгулюе ўмовы аплаты працы дзяржаўных служачых.

54. Аплата працы дыпламатычных супрацоўнікаў у дыпламатычных прадстаўніцтвах і консульскіх установах адбываецца ў замежнай валюце і беларускіх рублях.

Аплата працы ў замежнай валюце не падлягае падаткаабкладанню, на яе не налічваюцца ўзносы па дзяржаўным сацыяльным страхаванні і з яе не праводзяцца ўтрыманні, прадугледжаныя заканадаўствам.

Аплата працы ў замежнай валюце ажыццяўляецца са дня перасячэння Дзяржаўнай мяжы Рэспублікі Беларусь пры адбыцці для работы ў дыпламатычным прадстаўніцтве або консульскай установе і да дня перасячэння Дзяржаўнай мяжы Рэспублікі Беларусь пры вяртанні ў Рэспубліку Беларусь у сувязі з заканчэннем работы ў дыпламатычным прадстаўніцтве або консульскай установе.

Пры ўстанаўленні памеру аплаты працы ў замежнай валюце бяруцца пад увагу займаемая пасада, узровень жыцця ў краіне прабывання, кліматычныя ўмовы, а таксама ўмовы бяспекі.

55. Дыпламатычным супрацоўнікам устанаўліваюцца надбаўкі да службовых акладаў за дыпламатычныя рангі ў адпаведнасці з заканадаўствам.

Службовы аклад і надбаўка за дыпламатычны ранг складаюць разліковы службовы аклад. Дыпламатычным супрацоўнікам, якія маюць дыпламатычны ранг і клас дзяржаўнага служачага, выплачваецца адна з надбавак – за дыпламатычны ранг або клас дзяржаўнага служачага.

56. Дыпламатычным супрацоўнікам могуць устанаўлівацца іншыя даплаты ў парадку і памерах, устаноўленых Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

57. Устанаўліваюцца наступныя надбаўкі да службовых акладаў у замежнай валюце дыпламатычных супрацоўнікаў дыпламатычных прадстаўніцтваў і консульскіх устаноў:

кіраўнікам дыпламатычных прадстаўніцтваў, якія з’яўляюцца па сумяшчальніцтву надзвычайнымі і паўнамоцнымі pасламі ў іншых дзяржавах або па сумяшчальніцтву прадстаўнікамі пры міжнародных арганізацыях;

дыпламатычным супрацоўнікам дыпламатычных прадстаўніцтваў і консульскіх устаноў на ўтыманне непрацуючых, якія сумесна пражываюць з імі за мяжой жонкі (мужа), непаўналетніх дзяцей і непрацаздольных, якія знаходзяцца на іх утрыманні, паўналетніх дзяцей, у тым ліку ўсыноўленых (удачароных), пасынкаў і падчарыц.

Па прадстаўленні Міністра замежных спраў Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь па ўзгадненні з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь могуць устанаўлівацца надбаўкі да службовых акладаў у замежнай валюце:

надзвычайным і паўнамоцным паслам і пастаянным прадстаўнікам пры міжнародных арганізацыях за інтэнсіўнасць, напружанасць і рэзультатыўнасць работы;

дыпламатычным супрацоўнікам дыпламатычных прадстаўніцтваў і консульскіх устаноў у краінах з цяжкімі кліматычнымі ўмовамі, а таксама ў краінах, дзе вядуцца ваенныя дзеянні або склалася надзвычайная сітуацыя, якая пагражае іх бяспецы і бяспецы членаў іх сямей.

58. Памеры службовых акладаў дыпламатычных супрацоўнікаў дыпламатычных прадстаўніцтваў і консульскіх устаноў і надбавак да іх, парадак выплаты службовых акладаў і надбавак да іх у замежнай валюце і беларускіх рублях, а таксама іншыя ўмовы аплаты іх працы ўстанаўліваюцца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь па ўзгадненні з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

59. Дыпламатычным супрацоўнікам, якія накіраваны на работу ў дыпламатычныя прадстаўніцтвы і консульскія ўстановы, за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту:

выплачваецца аднаразовая дапамога ў замежнай валюце ў памеры ўстаноўленага службовага акладу ў замежнай валюце па пасадзе, на якую назначаны супрацоўнік;

аплачваюцца расходы ў сувязі з пераездам з Рэспублікі Беларусь у краіну прабывання і назад супрацоўніка і сумесна пражываючых з ім членаў сем’і, у тым ліку расходы па афармленні пашпартоў і віз, рэгістрацыі ў дзяржаве акрэдытацыі, а таксама расходы па праезду, па правозу багажу, па пражыванні за час у дарозе (сутачныя), па найму жыллёвага памяшкання ў выпадку вымушанай затрымкі ў дарозе;

прадстаўляюцца працоўныя адпачынкі ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь з захаваннем за дні адпачынку аплаты працы ў замежнай валюце ў памеры 50 працэнтаў службовага акладу з улікам устаноўленых надбавак на момант пачатку адпачынку, а таксама 100 працэнтаў з разліку службовага акладу ў беларускіх рублях па суаднесенай пасадзе ў МЗС з улікам устаноўленых надбавак, парадак і ўмовы выплаты якіх вызначаюцца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь па ўзгадненні з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь;

адзін раз у календарным годзе аплачваюцца расходы па праездзе супрацоўніка і сумесна пражываючых з ім членаў яго сям'і ў Рэспубліку Беларусь і назад для правядзення працоўнага адпачынку;

аплачваюцца транспартныя расходы пры выездзе ў Рэспубліку Беларусь і назад у сувязі са смерцю або цяжкай хваробай блізкага сваяка* супрацоўніка;

аплачваюцца расходы, якія звязаны з навучаннем дзяцей супрацоўніка ва ўстановах, якія забяспечваюць атрыманне агульнай сярэдняй адукацыі (у выпадку адсутнасці ў краіне прабывання бясплатных устаноў, якія забяспечваюць атрыманне агульнай сярэдняй адукацыі);

кампенсуюцца ва ўстаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь парадку расходы, якія звязаны са службовымі камандзіроўкамі ў краіне прабывання, у Рэспубліку Беларусь і трэція краіны;

аплачваецца матэрыяльная шкода, якая нанесена маёмасці супрацоўніка або сумесна пражываючых з ім членаў яго сям'і на працягу прабывання за мяжой у выніку надзвычайных і непераадольных пры дадзеных умовах абставін (непераадольнай сілы) у выніку ваенных дзеянняў, грамадзянскай вайны, тэрарыстычнага акту, злачыннага пасягальніцтва, надзвычайнай сітуацыі, стыхійнага бедства, тэхнагеннай катастрофы, эпідэміі (эпізаатыі) і іншых падобных абставін;

аплачваюцца расходы па медыцынскім страхаванні або аказанні медыцынскай дапамогі супрацоўніку, а таксама сумесна пражываючых з ім членам яго сям'і;

для выканання службовых абавязкаў прадастаўляюцца службовыя аўтамабілі ў парадку, устаноўленым Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь;

прадстаўляюцца жылыя памяшканні з мэбляй, абсталяваннем і інвентаром у парадку і ў межах нормаў, устаноўленых МЗС.

Парадак і ўмовы выплаты кампенсацый і дапамог, указаных у абзацах другім – дзясятым часткі першай сапраўднага пункта, устанаўліваюцца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

60. Дыпламатычныя супрацоўнікі, якія накіраваны на работу ў дыпламатычныя прадстаўніцтвы і консульскія ўстановы, падлягаюць абавязковаму дзяржаўнаму сацыяльнаму страхаванню ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

61. Дыпламатычным супрацоўнікам, якія накіраваны на работу ў дыпламатычныя прадстаўніцтвы і консульскія ўстановы, а таксама членам іх сямей, якія паступілі на работу ў дыпламатычныя прадстаўніцтвы або консульскія ўстановы ў дзяржаве прабывання, у выпадку часовай непрацаздольнасці ў перыяд работы за мяжой

---

* Пад блізкімі сваякамі ў сапраўдным Палажэнні разумеюцца бацькі, дзеці, у тым ліку ўсыноўленыя (удачароныя), усынавіцелі, родныя браты і сёстры, муж (жонка).

захоўваецца аплата працы ў замежнай валюце і беларускіх рублях за дні непрацаздольнасці, але не больш чатырох месяцаў запар.

62. Дыпламатычныя супрацоўнікі, накіраваныя на работу ў дыпламатычныя прадстаўніцтвы і консульскія ўстановы, а таксама сумесна пражываючыя з імі члены іх сямей падлягаюць абавязковаму дзяржаўнаму страхаванню жыцця і здароўя на выпадак гібелі (смерці),ранення (кантузіі), увечча, якія атрыманы пры ваканані абавязкаў у замежнай дзяржаве, у парадку, устаноўленым заканадаўствам для ваеннаслужачых, за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту.

У выпадку гібелі (смерці) дыпламатычнага супрацоўніка або сумесна пражываючага з ім члена сям'і аплата ўсіх расходаў, якія звязаны з перавозкай цела памерлага на тэрыторыі дзяржавы прабывання, яго адпраўкай на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь, ажыццяўляецца за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту.

63. Дыпламатычным супрацоўнікам дыпламатычных прадстаўніцтваў і консульскіх установаў, якія размешчаны ў краінах з цяжкімі кліматычнымі ўмовамі, прадстаўляецца дадатковы працоўны адпачынак за асобы характар работы працягласцю, у парадку і на ўмовах, устаноўленых Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь па ўзгадненні з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь для супрацоўнікаў дзяржаўных арганізацый Рэспублікі Беларусь, якія накіраваны на работу ў краіны з такімі кліматычнымі ўмовамі.

64. У стаж работы мужа або жонкі дыпламатычных супрацоўнікаў, якія накіраваны на работу ў дыпламатычныя прадстаўніцтвы і консульскія ўстановы, залічваецца час прабывання за мяжой пры ўмове, што на працягу гэтага перыяду за іх у Рэспубліцы Беларусь аплачваліся абавязковыя страхавыя ўзносы на пенсійнае страхаванне ў Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны.

Абавязковыя страхавыя ўзносы на пенсійнае страхаванне за мужа і жонку выплачваюцца дыпламатычнымі супрацоўнікамі ў памеры 30 працэнтаў мінімальнай заработнай платы, устаноўленай заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Парадак аплаты ўказаных абавязковых страхавых узносаў вызначаецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

65. Дыпламатычныя супрацоўнікі, якія накіраваны на работу ў дыпламатычныя прадстаўніцтвы і консульскія ўстановы, і сумесна пражываючыя з імі членаў іх сямей могуць без уплаты мытных пошлін, падаткаў, без абмежаванняў кошту і вагі ўвозіць у Рэспубліку Беларусь тавары, якія прадназначаны для асабістага карыстання, якія былі набыты імі на працягу работы за мяжой або часова вывезеныя з Рэспублікі Беларусь для бытавога абсталявання, у парадку, устаноўленым Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь для перамяшчэння праз мытную мяжу тавараў асабістага карыстання.

66. Нормы, устаноўленыя ў абзацах чацвёртым і восьмым часткі другой, часткі трэцяй пункта 18, пунктах 19, 27, 28, 30, 31, 35, частках першай – трэцяй пункта 36,

абзацах другім – пятым часткі першай, часткі другой пункта 37, пунктах 50, 54, абзацы трэцім часткі другой пункта 57, пункце 58, абзацах другім – дзясятым, дванаццатым часткі першай, часткі другой пункта 59, пунктах 60 – 63, 65 сапраўднага Палажэння, распаўсюджваюцца на супрацоўнікаў адміністратыўна-тэхнічнага персаналу, якія накіраваны на работу ў дыпламатычныя прадстаўніцтвы і консульскія ўстановы.

На работу адміністратыўна-тэхнічнага персаналу дыпламатычных прадстаўніцтваў і консульскіх установах, якія з'яўляюцца дзяржаўнымі служачымі, распаўсюджваюцца таксама нормы пунктаў 20 і 53 сапраўднага Палажэння.

Дадатак
да Палажэння аб дыпламатычнай
службе Рэспублікі Беларусь

СУАДНЕСЕНАСЦЬ

дыпламатычных пасад і
дыпламатычных рангаў

| Найменаванне дыпламатычных пасад | Дыпламатычныя рангі |
|---|---|
| **Міністэрства замежных спраў** | |
| Міністр замежных спраў, першы намеснік, намеснік  Міністра замежных спраў, Пасол па асобых даручэннях | Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол |
| Дырэктар дэпартамента, начальнікі галоўнага ўпраўлення, службы дзяржаўнага пратакола, самастойнага ўпраўлення (аддзела), першы намеснік дырэктара дэпартамента | Надзвычайны і Паўнамоцны Пасланнік першага класа |
| Намеснік дырэктара дэпартамента, намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення | Надзвычайны і Паўнамоцны Пасланнік першага класа – Надзвычайны і Паўнамоцны Пасланнік другога класа |
| Намеснік начальніка службы дзяржаўнага пратакола, намеснік начальніка самастойнага ўпраўлення (аддзела) | Надзвычайны і Паўнамоцны Пасланнік другога класа |
| Начальнік упраўлення (аддзела) у складзе дэпартамента (галоўнага ўпраўлення) | Надзвычайны і Паўнамоцны Пасланнік другога класа – саветнік першага класа |
| Начальнік аддзела ў складзе ўпраўлення, загадчык сектарам, старшы саветнік | Саветнік першага класа |
| Саветнік | Саветнік першага класа – саветнік другога класа |

| | |
|---|---|
| Першы сакратар | Першы сакратар першага класа – першы сакратар другога класа |
| Другі сакратар | Другі сакратар першага класа – другі сакратар другога класа |
| Найменаванне дыпламатычных пасад | Дыпламатычныя рангі |
| Трэці сакратар | Трэці сакратар |
| Аташэ | Аташэ |
| **Дыпламатычныя прадстаўніцтвы і консульскія ўстановы** | |
| Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь, Пастаянны прадстаўнік Рэспублікі Беларусь пры міжнароднай арганізацыі | Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол |
| Пасланнік Рэспублікі Беларусь | Надзвычайны і Паўнамоцны Пасланнік першага класа |
| Паверaны ў справах Рэспублікі Беларусь, саветнік-пасланнік, намеснік Пастаяннага прадстаўніка Рэспублікі Беларусь пры міжнароднай арганізацыі | Надзвычайны і Паўнамоцны Пасланнік першага класа – Надзвычайны і Паўнамоцны Пасланнік другога класа |
| Генеральны консул Рэспублікі Беларусь | Надзвычайны і Паўнамоцны Пасланнік другога класа – саветнік першага класа |
| Старшы саветнік, начальнік консульскага пункта | Саветнік першага класа |
| Саветнік, намеснік начальніка консульскага пункта | Саветнік першага класа – саветнік другога класа |
| Консул | Саветнік другога класа – першы сакратар першага класа |
| Першы сакратар | Першы сакратар першага класа – першы сакратар другога класа |
| Віцэ-консул | Першы сакратар другога класа – другі сакратар першага класа |
| Другі сакратар, консульскі агент | Другі сакратар першага класа – другі сакратар другога класа |

| | |
|---|---|
| Трэці сакратар | Трэці сакратар |
| Аташэ | Аташэ |